*УДК 82*

*М. І. МУШЫНСКІ*

# ВЯЛІКІ ДОЙЛІД НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

*Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 24.10.2011)*

Ёсць нешта сімвалічнае ў тым, што два вялікія сыны беларускага народа, два геніяльныя паэты Янка Купала і Якуб Колас нарадзіліся ў адзін і той жа год, і іх магутны голас, голас духоўных бацькоў нацыі, пракрокаў, загучаў фактычна ў адзін і той жа час. Каб сказаць цывілізаванаму свету новае слова пра сваю Бацькаўшчыну, пра лёс беларуса і ўзняць айчыннае прыгожае пісьменства на болей высокі эстэтычны ўзровень, напэўна, і патрэбны былі падвоеныя намаганні адораных самабытным талентам песняроў, якія ўвасобілі лепшыя рысы нацыянальнага характару беларусаў, іх высокі духоўны, інтэлектуальны патэнцыял. З першых крокаў паэтычнай творчасці Купала і Колас шукалі свой, адметны шлях у вялікую літаратуру, сваё мастацкае, вобразнае слова, якое б магло абудзіць душу чалавека, ускалыхнуць яго думкі, пачуцці, паклікаць да ўсвядомленай працы дзеля агульнанародных мэт, дзеля сцвярджэння высокіх гуманістычных ідэалаў. І гэтыя пошукі аказаліся паспяховымі: лірык, рамантык Купала і эпік, рэаліст Колас узбагацілі беларускае прыгожае пісьменства наватарскімі адкрыццямі, дасканалымі ў мастацкіх адносінах творамі, якія сталі сапраўдным укладам у сусветную літаратуру. Але працэс далучэння да агульначалавечых духоўных, маральна-этычных, эстэтычных каштоўнасцей у кожнага з іх адбываўся па-свойму, што і пацвярджае непаўторнасць творчай індывідуальнасці кожнага мастака.

Як творчая асоба Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, 1882–1956) – з'ява ўнікальная. Маштаб яго магутнага, самабытнага таленту здзіўляе, гэтак жа ўражвае і шматграннасць праяўлення творчых здольнасцей: паэт, празаік, драматург, публіцыст і перакладчык, вучоны і арганізатар айчыннай навукі, лексікограф, літаратурны крытык, педагог і метадыст, настаўнік і дарадца не аднаго пакалення моладзі – вось абсягі шматгадовай самаадданай працы Я. Коласа на літаратурнай ніве. І ў кожнай галіне народны пясняр пакінуў глыбокі, яскравы след. Яго дзейнасць як крытыка, перакладчыка, арганізатара навукі і літаратурна-творчага жыцця разгортвалася ў рэчышчы мэтанакіраванай барацьбы за эстэтычны ўзровень айчыннай літаратуры, за актыўнае засваенне лепшых здабыткаў сусветнай класікі. У шматлікіх артыкулах, выступленнях ён нястомна праводзіў думку пра неабходнасць творчай арыентацыі на лепшыя еўрапейскія, сусветныя традыцыі, на каштоўны вопыт славянскіх літаратур. І асабісты выбар Коласам твораў для перакладу на родную мову – паэмы «Палтава» А. Пушкіна, «Дэман» М. Лермантава, паэмы і вершы Т. Шаўчэнкі і інш. – наглядна пацвярджае справядлівасць сказанага.

Шмат зроблена Коласам як грамадска-палітычным дзеячам, дзеячам культуры, дэпутатам Вярхоўнага савета СССР і БССР, старшынёй рэспубліканскага камітэта абароны міру, адным з кіраўнікоў пісьменніцкай арганізацыі. Агульнапрызнаныя яго заслугі ва ўмацаванні сувязей, творчых кантактаў паміж беларускімі пісьменнікамі і майстрамі слова іншых рэспублік. Высокі маральны аўтарытэт Коласа як выдатнага мастака-гуманіста, пісьменніка-грамадзяніна, які паслядоўна захоўваў і асабістай творчай практыкай узбагачаў найбольш плённыя традыцыі нацыянальнай культуры, быў дзейсным фактарам кансалідацыі творчых сіл беларускага народа, фактарам выяўлення нераскрытых, патэнцыяльных здольнасцей нацыі. Мастакоўскія запаветы аўтара «Новай зямлі», «казак жыцця», «палескіх аповесцей» з'яўляюцца надзейным арыенцірам у ідэйна-

творчых пошуках беларускіх паэтаў, празаікаў, драматургаў на сучасным этапе. Дабратворныя традыцыіі Я. Коласа і сёння актыўна працягваюць і ўзбагачаюць новым сацыяльна-гістарычным, духоўным, інтэлектуальным, маральным вопытам народа многія мастакі слова нашых дзён.

Дзейнасць Я. Коласа ахоплівае вялікі прамежак часу, яна прыпадае на розныя гістарычныя эпохі. І на ўсіх этапах творчай працы пісьменнік, засноўваючыся на вопыце славутых папярэднікаў, уздымаў найбольш вострыя праблемы народнага жыцця, і адну з галоўных сваіх задач бачыў у тым, каб вывесці беларускую літаратуру на еўрапейскі, сусветны ўзровень, каб праз вобразнае, мастацкае слова раскрыць сутнасныя рысы, глыбінныя асновы нацыянальнага характару беларуса – працалюбства, пачуццё справядлівасці, памкненне жыць у згодзе з суседзямі, непадробную любоў да роднага краю. Але шлях да ажыццяўлення пастаўленай задачы быў складаны. Існавалі шматлікія цяжкасці, перашкоды, народжаныя неспрыяльнымі грамадска-палітычнымі абставінамі, у якіх на пачатку ХХ ст. знаходзілася сацыяльна і нацыянальна прыгнечаная Беларусь. Неабходна было даць абяздоленаму хлебаробу кніжку на матчынай мове з тым, каб ён адчуў адказнасць за свой лёс і лёс Бацькаўшчыны, каб у яго з’явілася жаданне звацца беларусам, мець сваю школу, сваю газету, нацыянальны тэатр. Гістарычная заслуга Коласа-пісьменніка перад беларускай літаратурай яшчэ і ў тым, што ён унутраным чуццём дакладна ўлавіў галоўныя тэндэнцыі літаратурнага працэсу свайго часу, зразумеў задачы, якія тады паўсталі перад нацыянальна свядомай часткай грамадства. Неабходна было выпрацаваць шмат у чым новы погляд на галоўнага героя літаратуры – селяніна, і гэты погляд увасобіць у канкрэтных вобразах, г. зн. паказаць хлебароба не толькі як ахвяру несправядлівага сацыяльнага ладу, але і як унутрана багатую асобу, здольную ўласнымі сіламі дабіцца лепшага жыцця. Я. Колас добра разумеў, што сацыяльная пасіўнасць, абыякавае стаўленне селяніна да ўласнага лёсу, звычка цярплiва, пакорліва зносіць крыўду і здзек – не адпрыродныя якасці, а рысы, выхаваныя эпохай прыгоннага права, эпохай прыгнёту і бязлітаснай эксплуатацыі. Пры змене сацыяльна-палітычных умоў працоўны хлебароб зможа праявіць усе свае адпрыродныя здольнасці.

Літаратурным дэбютам маладога паэта стаў верш «Наш родны край» (1906). Тут яскрава выявілася асноўная танальнасць лірыкі Я. Коласа ранняга перыяду. Менавіта гаротнае становішча народа ў забытай Богам, беднай старонцы («у гразі жыве ён, ходзіць, а працуе – льецца пот» [1, т. 1, с. 168]) спарадзіла сумнае гучанне паэтавай песні. У вершах «Дарога», «Песня над калыскай», «Людскія слёзы», «Доля батрачкі» створаны праўдзівы малюнак жыцця працоўнага беларуса, які спрабуе зразумець прычыну свайго незайздроснага становішча («Ці за грэх закляты я не маю долі?» [1, т. 1, с. 168]). І ўсё ж лірычны герой Коласа знаходзіць у сабе ўнутраныя сілы на тое, каб суцешыць селяніна-пакутніка, падтрымаць яго ў хвіліны скрухі, роспачы і адчаю: «Ўстаньце, хлопцы, Ўстаньце, браткі» [1, т. 1, с. 149], – заклікае ён працоўны люд («Беларусам»). Матыў веры ў жыццядайныя сілы народа, у здольнасць працоўнага чалавека перайначыць жыццё выразна гучыць у многіх вершах («Згнанніку», «Наша возьме», «Нягода» і інш.).

У верасні 1908 года за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе (ліпень 1906) і напісанне лістоўкі Я. Колас быў на тры гады пазбаўлены волі. Турэмнае трохгоддзе стала суровай школай маральнай, духоўнай загартоўкі паэта, а набыты ў Пішчалінскім замку вопыт дапамог вынесці складаныя выпрабаванні, што выпалі на долю пісьменніка ў трагічныя 1930-я гады. Астрожная паўсядзённасць, змрочная атмасфера паднявольнага жыцця наглядна высвецілі сутнасныя рысы характару беларускага песняра: за гэты час паэт не расчараваўся ў тых высокіх гуманістычных ідэалах, якія сцвярджаў у ранейшых творах. Колас здолеў узняцца над асабістай крыўдай, бо пры самых неспрыяльных жыццёвых варунках адчуваў непарыўнае адзінства з роднай глебай і ў аснову твораў нязменна браў маральна-этычныя ўяўленні, выпрацаваныя народам. І ў няволі паэт усведамляў сваю місію народнага заступніка, будзіцеля духу. І гэтае ўсведамленне замацоўваў у вершаваным слове, дбаючы пра яго дасканаласць.

Дамінуючым матывам тут стаў матыў нявольніцтва, адарванасці ад бацькоўскай хаты, ад родных, сум па страчанай волі, сум па незваротнай вясне («Ноч у астрозе», «Смерць арыштанта», «Катаржнікі» і інш.). Мастацкае значэнне гэтых вершаў у тым, што створаны паэтам вобраз астрога, вобраз турмы ўздымаецца на ўзровень мастацкага сімвалу. Па сутнасці, гэта быў вобраз зняволенай, прыгнечанай Беларусі, а кінутыя за краты «бунтаўшчыкі» ўвасаблялі дух і сілу

няскоранага беларуса. Матыў маральнай нязломнасці чалавека, які змагаецца за агульнанародныя ідэалы, таксама адзін з галоўных у турэмнай лірыцы Я. Коласа.

Побач з вершамі палітычнага гучання, антыдзяржаўнай скіраванасці («Канстытуцыя», «Малебен», «У судзе») за турэмнымі кратамі нарадзіліся і змястоўныя ўзоры філасофскай лірыкі, дзе гучыць роздум паэта над сэнсам жыцця, мэтай чалавечага існавання ( «Забытая магіла», «Арол» і інш.). З гуманістычных пазіцый абараняе Колас чалавека як найвялікшую каштоўнасць, з пачуццём горычы гаворыць пра абыякавых людзей, раўнадушных да чужога гора. Філасофская, медытатыўная лірыка Коласа турэмных гадоў уздымала ўсю тагачасную айчынную паэзію на новы ўзровень, умацоўвала яе чалавеказнаўчы пачатак. Дзейсным сродкам раскрыцця паэтычнай думкі ў згаданых вершах з'яўляецца сімвалічны вобраз, які надае твору сэнсавую шматзначнасць, мастацкую абагульненасць, падтэкставую глыбіню.

Пашырэнне тэматычных межаў паэзіі, вядома, не было для Коласа самамэтай. Распрацоўка новай тэмы, новага паэтычнага матыву прыносіла адпаведна і новы вобраз, моўна-выяўленчыя сродкі, што і з'яўлялася рэальным укладам паэта ў нацыянальнае прыгожае пісьменства. Адзнакі такога наватарства можна бачыць, напрыклад, у вершы «Роднаму краю» (1913) – праграмным творы, у якім аўтар узняўся да шырокіх гісторыка-філасофскіх абагульненняў: у вершы выразна гучыць матыў «чужога граху», які беларускі народ вымушаны выкупляць уласнымі пакутамі і незлічонымі ахвярамі («За каго ж мы, запытаем, // Цяжкі крыж нясём?» [1, т. 2, с. 39–40]). Нельга ісці ўвесь час «у хвасце другіх» народаў, бо ў нас ёсць вялікія духоўныя набыткі, якімі можна ганарыцца перад суседзямі. Толькі трэба болей актыўна шукаць шляхі, што выведуць беларусаў у шырокі свет. Менавіта ў такім шырокім плане разгортваецца аўтарская гісторыка-філасофская думка. Такім жа нечаканым мастацкім вобразам стаў вобраз нацыянальнага беларускага дома ў вершы «На Новы год» (1914) («Калі ўступім у дом, што вякамі // Будавалі, вякамі ішлі, // Усцілаючы сцежку касцямі...» [1, т. 2, с. 45]). У аўтарскай інтэрпрэтацыі дом – гэта аналаг паняцця волі, свабоды, незалежнасці, шлях дасягнення якой доўгі, пакутлівы. Адсюль зразумела заканамернасць з'яўлення ў паэзіі Коласа матыву дарогі, пошуку шляхоў у будучыню («У дарозе», «У дарогу», «На дарозе», 1912; «З дарогі», 1914; «Дарога», 1916; «Дзве дарогі», 1917). Лірычны герой гэтых вершаў напружана думае, якой жа дарогай трэба ісці, каб дасягнуць пастаўленай мэты, спасцігнуць праўду жыцця, сэнс чалавечага існавання і тыя прычыны становішча, у якім апынуўся беларускі народ.

Колас-мастак надзвычай чуйна рэагаваў на змены ў грамадскім жыцці, і яго ўспрыманне гэтых зрухаў знаходзіла свой адбітак, сваё ўвасабленне ў мастацкім вобразе. Такім стаўленнем да знешняга свету і да паводзін чалавека ў свеце Колас фарміраваў тып беларускага пісьменніка-грамадзяніна, творчасць якога была жывым рэхам шматстайных праяў жыцця. Паэзія перыяду Першай сусветнай вайны («Ворагам», «Неўспагаднасць», «Люд стогне, гаруе пад цяжарам мяча» і інш.) яскрава пацвярджае справядлівасць сказанага. Пафасам рашучага непрымання вайны як вялікай народнай трагедыі, гнеўным асуджэннем тых, хто распачаў «усясветную трасяніну», прасякнуты згаданыя вершы. Вайна пагражае існаванню самога жыцця: «Знішчэнне, мах яе бязмерны, // Згінота цяжкая зямлі!» [1, т. 2, с. 73]). Маладыя паэты, якія ішлі ў літаратуру ў 1920-я і пазнейшыя гады, мелі магчымасць грунтавацца на здабытках антымілітарысцкай паэзіі Коласа-гуманіста.

Яшчэ адным сведчаннем пашырэння дыяпазону творчых інтарэсаў паэта-вязня стала лірыка інтымных пачуццяў. Спробы асваення жанру любоўнай лірыкі мелі істотнае значэнне ў творчасці Я. Коласа як пісьменніка пераважна эпічнага складу. Вершы, у якіх даследавалася інтымнае жыццё, свет асабістых пачуццяў чалавека, рыхтавалі з'яўленне сацыяльна-псіхалагічнай, аналітычнай прозы, адным з заснавальнікаў якой у найноўшай літаратуры Колас і стаў. І ў гэтым яго вялікая заслуга перад нацыянальнай літаратурай.

Колас узбагаціў нацыянальнае прыгожае пісьменства празаічнымі жанрамі, якія ў XIX ст. былі яшчэ ў зародкавым стане, і паводле свайго ўзроўню значна ўступалі ўзроўню твораў суседніх літаратур, дзе проза функцыянавала паспяхова, карысталася шырокай папулярнасцю ў чытацкім асяроддзі. Знаёмячыся з рускай, украінскай, польскай літаратурамі, беларускі пісьменнік бачыў, што айчыннае слоўнае мастацтва не можа паспяхова забяспечыць духоўныя патрэбы грамадства,

разнастайныя чытацкія запатрабаванні без наяўнасці ў ім празаічных жанраў. Вось чаму ўжо з першых крокаў сваёй дзейнасці на старонках «Нашай нівы» малады пісьменнік пачаў актыўна запаўняць белыя плямы на беларускай літаратурнай карце празаічнымі творамі – апрацоўкамі рэальных здарэнняў, побытавымі абразкамі, кароткімі замалёўкамі («Чорт», «Кірмаш», «Дзяліцьба» і інш.). Але даволі хутка на змену згаданым творам прыйшлі апавяданні, у якіх была пастаўлена актуальная грамадская, маральна-этычная праблема, а ў цэнтры аказаўся герой з багатым унутраным светам. На раскрыццё псіхалогіі гэтага героя, яго думак, разважанняў пра шляхі вызвалення ад прыгнёту, эксплуатацыі і скіроўвалася асноўная ўвага пісьменніка.

Апавяданні «Нёманаў дар», «Дзеравеншчына», «У старых дубах» (1912), «Малады дубок» (1913), «Сірата Юрка» (1914), «На чыгунцы» (1915) – гэта выдатны ўзор змястоўнай сацыяльна-аналітычнай прозы «малой» формы. Тут створаны запамінальныя мастацкія вобразы герояў (Васіль Падбярэзны, Андрэй Плех, падлеткі Базыль, Юрка і інш.). Праз разнастайныя жыццёвыя калізіі, праз вострыя драматычныя сутыкненні гэтыя героі выяўляюць такія рысы характараў, як сумленнасць, дабрыня, здольнасць да суперажывання чужому гору, імкненне жыць згодна з законамі хрысціянскай этыкі.

Апавяданні Я. Коласа сталі надзейным падмуркам беларускай мастацкай прозы, асновай далейшага развіцця ў ёй разнастайных жанравых і стылёвых форм – аповесці, драматызаванай аповесці, рамана, твораў дакументальна-мастацкай жанравай структуры, эпісталярнай прозы. І ў гэтым – бясспрэчная заслуга Коласа перад айчынным прыгожым пісьменствам, перад нацыянальнай культурай.

Глыбокім наватарствам пазначаны і алегарычныя апавяданні Коласа, якія атрымалі назву «Казкі жыцця». Даследчыкі слушна ацэньваюць дадзеную жанравую форму як сапраўднае мастацкае адкрыццё Коласа-празаіка. Першыя «казкі жыцця» датуюцца 1906 г. («Дудар»), 1907 г. («Жывая вада»), але найбольш плённа пісьменнік працаваў над гэтай арыгінальнай жанравай структурай у 1912–1914 і пазнейшых гадах – «Адзінокае дрэва», «Зло – не заўсёды зло», «На чужым грунце», «Камень», «Хмарка», «Балотны агонь», «Чыя праўда?». Згаданыя творы прадэманстравалі іх надзвычай багатыя змястоўна-выяўленчыя магчымасці «казак жыцця» як твораў, прыналежных да філасофскай прозы, здатнай ставіць самыя складаныя праблемы маральна-этычнага, грамадска-палітычнага, быційнага характару. Але вырашаюцца яны не сродкамі пісьма, уласцівага сацыяльна-бытавой прозе, а ў адпаведнасці з прыродай алегарычнага жанру, дзе вобраз не звязаны з канкрэтным гістарычным часам, рэгіянальнымі ці нацыянальнымі асаблівасцямі, ён нясе вялікае абагульненне, заключае ў сабе шматзначны сэнс. Тым не менш, у вобразах адзінокага Дрэва, Жолуда на старым дубе, закінутага Жытняга Коласа выяўлены вострыя, набалелыя праблемы, якія хвалявалі нацыянальна свядомых прадстаўнікоў тагачаснага грамадства. Так, незайздросная доля адзінокага Жытняга Коласа, што вырас між нядобразычлівых, ганарыстых лугавых траў («На чужым грунце») – гэта доля народаў, нацый, адсунутых на ўзбочыну гісторыі болей моцнымі суседзямі. У сферы інтэлектуальных інтарэсаў герояў «казак» – роздум над складанымі праблемамі анталагічнага характару: над шляхамі пазнання сэнсу жыцця, над мэтай чалавечага існавання. Яны шукаюць адказы на пытанні, што такое «шчасце», «ісціна», «праўда», «справядлівасць». У нязмушанай манеры дзеліцца аўтар «казак» з чытачом уласнымі думкамі, меркаваннямі на гэты конт або выкарыстоўвае маральна-этычны вопыт, назапашаны народам на працягу многіх стагоддзяў гістарычнага быцця.

Пры гэтым пісьменнік не зводзіць сэнс алегарычнага твора да банальных павучанняў, спрошчаных маралізатарскіх сентэнцый, наказаў эталагічнага характару. Ён выступае ў ролі мудрага, разважлівага суразмоўцы, які верыць у свайго чытача, у яго высокія інтэлектуальныя здольнасці, спадзяецца на ўзаемнае паразуменне. І таму маральныя пастулаты, філасофскія максімы, якія гучаць у «казках», не ўспрымаюцца як навязванне чужых думак. Пісьменнік хоча, каб чытач самастойна спасціг іх сэнс. Праз усе «казкі жыцця» праходзіць ідэя даверу да жыцця, да жыватворных пачаткаў, праходзіць думка пра неабходнасць заглыбляцца ў сацыяльную рэчаіснасць, асэнсоўваць яе супярэчнасці. «Казкі жыцця» адыгралі значную ролю ў развіцці і станаўленні таленту Якуба Коласа як мастака гарманічнага складу. Алегарычныя творы з іх адметнай вобразнасцю і стылістыкай, з іх устаноўкай на сціслае, скандэнсаванае выяўленне думкі спрыялі выпрацоўцы цэласнага погляду на жыццё, на чалавека.

Падзеі Першай сусветнай вайны прымусілі Я. Коласа на доўгі час (верасень 1917 – май 1921 гг.) пакінуць Беларусь: ён быў прызваны на ваенную службу, потым закончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча і ў чыне падпаручніка накіроўваецца на Румынскі фронт. Там паэт захварэў і, атрымаўшы адпачынак, едзе на Куршчыну, дзе ў эвакуацыі знаходзілася яго сям'я. Уладкоўваецца на працу настаўнікам, школьным інспектарам.

15 мая 1921 г. Я. Колас прыязджае ў Мінск. Пачынаўся новы этап яго творчай і грамадска-культурнай дзейнасці. Вершы, апавяданні, аповесць «У палескай глушы» (1921–1922), паэма «Новая зямля» (1911–1923) сталі не толькі значным укладам Я. Коласа ў айчынную «малую» і «вялікую» прозу і нацыянальны ліра-эпас, але і акрэслілі найбольш перспектыўны напрамак іх развіцця – напрамак глыбокага аналізу сацыяльнай рэчаіснасці, усебаковага даследавання грамадскай практыкі і духоўнага свету чалавека ў яго шматстайных сувязях з эпохай. Паэт разумеў, што многія старыя літаратурныя формы аджылі свой век і ўжо не могуць актыўна ўплываць на свядомасць, на пачуцці беларуса. Патрэбна новае слова. І гэтае слова беларускі пясняр настойліва шукаў і знаходзіў. Мастацкая каштоўнасць такіх вершаў, як «Крыжы», «Цені-страхі», «Звон шыбаў», у тым, што яны плённа працягвалі традыцыі паэтаў-сімвалістаў, А. Блока, І. Севяраніна, А. Белага і інш., тут багата яскравых, арыгінальных сімвалічных вобразаў, напоўненых глыбокім зместам, які народжаны менавіта тагачаснай беларускай рэальнасцю, канкрэтнымі гістарычнымі падзеямі. І асэнсаваны падзеі з пункта гледжання нацыянальных інтарэсаў беларускага народа, яго гістарычнай будучыні. Лірычны герой згаданых вершаў – інтэлектуальная асоба, якая ўмее думаць і якую турбуе пытанне лёсу народа, лёсу Бацькаўшчыны, будучыня краіны: якую дарогу павінен абраць беларус, каб яго мара пра светлы заўтрашні дзень нарэшце стала явай?

Аб тым, што Я. Колас на пачатку 1920-х гг. узыходзіў на якасна новы светапоглядна-творчы ўзровень дзейнасці, сведчаць і апавяданні «Пад Новы год», «Дудар», «Салавей». Дзякуючы алегарычным вобразам, пісьменніку ўдалося дасягнуць шырокіх абагульненняў філасофскага характару. Не менш значнымі былі дасягненні Коласа і як аўтара апавяданняў, вытрыманых у рэалістычнай стылёвай манеры («Сяргей Карага», «Дачакаўся», «Крывавы вір», «Курская анамалія», «Пракурор», «Туды, на Нёман!»). Апавяданні звернуты пераважна да адлюстравання трагічных падзей грамадзянскай вайны, да мастацкага выяўлення супярэчнасцей, народжаных новай гістарычнай эпохай. Гераізм, праяўлены ў час рашучага супрацьстаяння з белай арміяй, прага помсты прадстаўнікам былога пануючага класа, разбурэнне ранейшага жыццёвага ўкладу і маральна-этычных норм, жыццёвая драма «ўчарашніх», пакутлівы лёс бежанцаў-беларусаў на Куршчыне – вось змест згаданых вышэй твораў, паводле сваёй структуры блізкіх да жанру аповесці. На жанравую трансфармацыю апавяданняў паўплывала складанасць узнятых праблем, вастрыня жыццёвых супярэчнасцей, імкненне пісьменніка раскрыць вобразы герояў на шырокім грамадска-бытавым фоне, заглыбіцца ў псіхалогію дзеючых асоб, перадаць супярэчлівы рух іх думак, пачуццяў, змены ў іх свядомасці. Мастацкая вартасць гэтых твораў – у гранічнай праўдзівасці, з якой малююцца падзеі грамадзянскай вайны, у высвятленні глыбінных прычын нянавісці працоўных да пануючага класа і выкліканых гэтым пачуццём той жорсткасці і бязлітаснай помсты, у выніку якіх ахвярамі сялян становяцца і не вінаватыя (вобраз паніча ў «Крывавым віры»). У апавяданнях выразна правілася гуманістычная пазіцыя Коласа, яго ўстаноўка на паслядоўную абарону чалавека, ідэй дабрыні, спагады і міласэрнасці. Намаганні пісьменніка, скіраваныя на тое, каб пафасам сваіх твораў умацоўваць гуманістычныя асновы беларускай літаратуры, абараняць агульначалавечыя каштоўнасці, павінны быць ацэнены па вялікім рахунку. Тым болей, калі мець на ўвазе, што згаданыя вышэй апавяданні пабачылі свет напярэдадні жорсткіх 1930-х гг.

Найбольш значным мастацкім дасягненнем Коласа перыяду 1920-х гг. у ліра-эпічным жанры стала паэма «Новая зямля». Адразу па выхадзе твора з друку беларуская крытыка ў асобе прафесара І. І. Замоціна дакладна вызначыла галоўныя вартасці паэмы – яе народнасць, глыбокі змест, арыгінальнасць формы ўвасаблення аўтарскай задумы, арганічную сувязь жанру і стылю. Праўда, не прымусілі сябе чакаць і адмоўныя водгукі, аўтары якіх раілі выкінуць паэму з арсенала барацьбы за светлую будучыню, бо яна прасякнута «дзікім народніцка-інтэлігенцкім патрыятызмам» (Л. Жыцень), ідэалізуе хутарскую гаспадарку, адасобленасць чалавека ад гра-

мадства. Гісторыя пераканаўча адхіліла гэтыя недарэчныя сцверджанні і заслужана паставіла паэму ў шэраг лепшых твораў сусветнага слоўнага мастацтва. Значэнне «Новай зямлі» для нацыянальнай літаратуры трэба бачыць у навізне яе жанравай формы і ў новым падыходзе аўтара да асэнсавання тэмы народа, пошуку ім шляхоў у будучыню, тэмы народнага жыцця, уяўленняў працоўнага беларуса пра сэнс чалавечага існавання.

У паэме па-мастацку пераканаўча раскрыты глыбінныя асновы народнага жыцця, у новым святле паказаны беларускі селянін – не як пасіўная ахвяра эксплуататарскага ладу, неспрыяльных сацыяльных абставін і ўмоў, а як рэальная сіла гісторыі, як працаўнік з багатым унутраным светам, з неадольнай прагай волі, свабоды, з памкненнем мець уласную зямлю, быць яе гаспадаром. «Свая зямля» ўспрымаецца як сінонім паняццяў «свабода», «незалежнасць». Такі погляд паступова выпрацоўваўся ў творчасці Коласа, паэта, празаіка, публіцыста, але ў паэме ён набыў новую форму свайго выяўлення – праз цэласную аўтарскую канцэпцыю ў завершаным, па-мастацку дасканалым маштабным творы. Гэтым самым аўтар «Новай зямлі» накрэсліваў вельмі перспектыўны шлях для ўсёй тагачаснай беларускай літаратуры, у тым ліку для яе жанравага абнаўлення, даваў паэтам, празаікам узор смелых і плённых мастацкіх пошукаў.

Пісьменніцкая засяроджанасць на побыце, норавах, звычаях, светаадчуванні і працы герояў твора дапамагла ўзняць «пасаду» і яе жыхароў на ўзровень вобразнай мадэлі нармальнага, г. зн. духоўна прасветленага жыцця, пры якім захоўваецца і памнажаецца найболей каштоўнае зназапашанага папярэднімі пакаленнямі. Аўтар паэмы як глыбокі і мудры паэт-філосаф смела дастасаваў да сваіх герояў не вузкапобытавую мерку, а мерку быційную, выпрацаваную сусветнай літаратурай. І аказалася, што героі «Новай зямлі» гэтай мерцы цалкам адпавядаюць, паспяхова вытрымліваюць маштаб маральна-этычнага вымярэння.

Надзвычай каштоўнае і тое, што героі «Новай зямлі» жывуць у цесным адзінстве з прыродай, успрымаюць яе як з'яву арганічную, унутрана ім блізкую. Жаданне справядлівасці, прага свабоды таксама імі разумеюцца як штосьці вельмі натуральнае, уласцівае натуры чалавека. Таму і пачынаюць яны ў цяжкіх роздумах, сумненнях пакутліва шукаць выйсце. Палясоўшчык Міхал, яго брат Антось, члены сям'і прываблiваюць высокімі маральнымі якасцямі, перш за ўсё – унутранай, душэўнай прыгажосцю, чалавечнасцю, прыстойнасцю, павагай да зямлі-карміцелькі. Праца для іх – не праклён, а святы абавязак. Міхал цвёрда перакананы, што толькі працай рук сваіх, настойлівасцю ён дасягне пастаўленай мэты, разарве путы здзеку і няволі, крыўднай залежнасці ад тых, хто мае ўладу над бяспраўным хлебаробам. Гэту веру Міхал хоча прышчапіць дзецям і дасягае поспеху: мы бачым, што ў хаце лесніка пануе сапраўдны культ працы, няма сур'ёзных канфліктаў, сварак, крыўды і непаразумення. Аб шырыні поглядаў Міхала на свет яскрава сведчыць і яго жаданне далучыць дзяцей да ведаў, пачцівае стаўленне да кнігі, у якой адбіты, увасоблены багаты агульначалавечы вопыт.

У непасрэднай сувязі з вырашэннем героямі паэмы галоўнай, лёсавызначальнай задачы – набыць уласную зямлю – знаходзіцца і пытанне сэнсу іх жыцця, прызначэння ў свеце. Да чаго імкнецца панскі ляснік? Набыць статус свабоднага, незалежнага гаспадара і жыць паводле прынцыпаў справядлівасці на ўласнай зямлі і ў сваёй хаце! Так, пад пяром мастака-гуманіста вобраз уласнай хаты ўздымаецца на ўзровень шырокага абагульнення, на ўзровень паэтычнага сімвалу Бацькаўшчыны, а жыццё герояў ва ўласным доме, на ўласнай сядзібе ўвасабляе ажыццяўленне велічнага ідэалу пісьменніка-патрыёта – ідэалу паўнакроўнага жыцця народа ў сваім родным краі. Шматлікія ж раздзелы, у якіх маляўніча ўзноўлены побыт жыхароў «леснікоўай пасады», іх паўсядзённыя клопаты, нечаканыя прыгоды і здарэнні – гэта і ёсць напаўненне сімвалічнага вобраза Беларускага нацыянальнага дома канкрэтна-жыццёвай рэальнасцю. Апаэтызаваны побыт беларускага селяніна-працаўніка надае асаблівую пераканаўчасць аўтарскай ідэі нацыянальнага дома. «Новая зямля» – твор невычэрпнай вобразна-сэнсавай глыбіні, галоўная кніга не толькі творчасці Я. Коласа, але і ўсяго беларускага прыгожага пісьменства. Вечная кніга.

Другім этапным творам Я. Коласа стала паэма «Сымон-музыка» – твор рамантычны, з моцным лірычным струменем. Гэта ўзнёслы, велічны гімн у гонар няскоранага духам мастака, у гонар мастацтва, якое нясе голас праўды, абараняе высокія ідэалы гуманізму, справядлівасці, чала-

вечай дабрыні, веры ў перамогу жыццесваральных пачаткаў. «Новая зямля» і «Сымон-музыка» – дзве роўнавялікія паэтычныя вышыні, якія годна ўпрыгожваюць нацыянальны літаратурны ландшафт і акрэсліваюць два аднолькава прадуктыўныя кірункі развіцця айчыннага пісьменства – кірунак эпіка-рэалістычны і лірыка-рамантычны, які прадугледжвае ўмоўна-казачны элемент, сімволіка-алегарычную вобразнасць. А гэтыя кірункі цалкам адпавядалі ўнутраным патрэбам тагачаснай літаратуры, паколькі традыцыйных рэалістычных форм было ўсё ж недастаткова, каб адлюстраваць увесь спектр жыцця з належнай паўнатой. Літаратуры патрэбны і ўмоўна-казачны элемент, і сімволіка-алегарычная вобразнасць, і высокі рамантычны пафас. У паэме пра музыку якраз і выкарыстаны менавіта гэтыя вобразна-выяўленчыя сродкі – падзеі містычнага характару, паэтычныя абагульненні, прарочыя сны, варожбы, заклінанні і інш. У дадзеным выпадку алегорыя, сімволіка, цудоўнае выратаванне гераіні ад цяжкай хваробы – усё гэта арганічна адпавядала характару героя-рамантыка, яго светаўспрыманню, яго поглядам на жыццё.

Паэма «Сымон-музыка» – наватарская не толькі паводле сваёй формы, кампазіцыі, жанравай адметнасці, цікавага спалучэння рамантычнага і рэалістычнага пачаткаў, але і ў праблемназмястоўных адносінах. Гэта твор пра жыццядайную сілу мастацтва, якое роднымі каранямі звязана з народным жыццём, з нацыянальнымі традыцыямі, з вуснай творчасцю. Перад чытачом разгортваецца драматычны лёс адоранага ад прыроды вясковага хлапчука, які марыў авалодаць прафесійным майстэрствам, каб несці людзям голас праўды, дабра, справядлівасці. Дзіцячы ўзрост не перашкодзіў хлапчуку бачыць недасканаласць свету, людскую чэрствасць, абыякавасць да чужога гора. На яго шляху паўстаюць, здавалася б, непераадольныя перашкоды ў асобе скваппага жабрака, хітрага карчмара, пыхлівага панскага капельмайстра, кожны з якіх імкнецца выкарыстаць здольнасці бяспраўнага, безабароннага музыкі ў карыслівых, эгаістычных мэтах. Яны перашкаджаюць яму стаць сапраўдным песняром народнай долі. Але герой-рамантык усё ж здолеў сілай духу пераадолець жыццёвыя перашкоды, і ў фінале твора ён выратоўвае хворую дзяўчыну Ганну.

Сымон насіў у сэрцы вобраз Ганны як увасабленне хараства, прыгажосці і надзей на шчаслівую будучыню. І, губляючы дзяўчыну, ён губляў бы сэнс свайго жыцця, велічныя ідэалы і веру ў заўтрашні дзень. Вось чаму музыка прыкладвае ўсе намаганні, каб уратаваць Ганну-будучыню. І Сымонавы спевы-гранні робяць сапраўдны цуд: магутная ўнутраная сіла, закладзеная ў чароўную мелодыю, вырывае Ганну з палону цемры, прасвятляе яе розум. Светлыя пачаткі бяруць верх над ноччу-цямніцай. Дзяўчына вяртаецца да жыцця і разам з Сымонам ідзе ў новы шлях.

Цудадзейнае выратаванне гераіні нясе глыбокі сімволіка-алегарычны сэнс. Сымон выявіў невычэрпныя магчымасці мастацтва, калі яно прасякнута ідэяй дабрыні, праўды, любові да чалавека і калі ўвасабляе народны дух, гістарычную памяць народа. Таму і творцы нацыянальнага мастацтва, якія ўсведамляюць сваю місію гуманістаў-асветнікаў, адраджэнцаў, здольныя ўзняць Беларусь да новага жыцця. Вось такой глыбокай думкай прасякнута паэма «Сымон-музыка» – адзін з найбольш дасканалых твораў беларускай літаратуры.

Этапнай з'явай у творчай біяграфіі Я. Коласа сталі таксама і аповесці «У палескай глушы» (1921–1922) і «У глыбі Палесся» (1926–1927). Тут працягвалася распрацоўка праблематыкі паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка». Аднак гэта быў новы крок у ідэйна-светапоглядным станаўленні пісьменніка, у яго пошуках новых форм адлюстравання, паколькі Колас упершыню звярнуўся да вялікай празаічнай формы. Адметная рыса новых твораў – у шырокім выкарыстанні аўтабіяграфічнага матэрыялу, які істотна паўплываў на змест, кампазіцыю «палескіх аповесцей», надаў ім асаблівую цеплыню, інтанацыю даверлівасці да аўтарскага расповеду.

Трэба па вялікім рахунку ацаніць грамадзянскую смеласць Коласа, які не пабаяўся закідаў афіцыйнай крытыкі ў неактуальнасці распрацоўкі тэмы вясковай інтэлігенцыі, асабліва яе ідэалізацыі як нібыта рухаючай сілы ў рэвалюцыйнай барацьбе, што, маўляў, вяло да недаацэнкі ролі рабочага класа. Гэткай жа небяспечнай, на думку афіцыёзу, была і прапаганда шкоднай «нацдэмаўскай» ідэі самабытнасці Палесся.

Смелая творчая задума пісьменніка атрымала сваё годнае мастацкае ўвасабленне: «палескія аповесці» ўвайшлі ў нацыянальнае слоўнае пісьменства як выдатны ўзор сацыяльна-псіхала-

гічнай, аналітычнай прозы, што цалкам адпавядала галоўнаму кірунку станаўлення тагачаснай беларускай літаратуры. Аўтарам створаны паўнакроўны вобраз беларускага інтэлігента Лабановіча, не па гадах сталага, духоўна багатага, схільнага да аналізу, да глыбокага роздуму над маральна-этычнымі, філасофскімі, быційнымі, сацыяльнымі праблемамі. Пошукі сэнсу жыцця, спасціжэнне таямніц прыроды, сумленнасць, прага справядлівасці якраз і складаюць аснову яго характару. Настаўнік праходзіць складаны шлях унутранага развіцця, светапогляднага станаўлення. На пачатковым этапе асноўным сродкам паляпшэння жыцця ён лічыў асвету, абуджэнне грамадскай свядомасці чалавека, выхаванне ў яго пачуццяў самапавагі і ўласнай годнасці. Стасункі з прадстаўнікамі розных сацыяльных класаў грамадства, з працоўным сялянствам, з калегамі па настаўніцкай працы, з чыноўнікамі, духавенствам многаму навучылі Лабановіча. Сутыкненні з людзьмі, носьбітамі супрацьлеглых поглядаў загартавалі яго характар, але адначасова прымусілі перагледзець некаторыя ранейшыя маральныя ўстаноўкі і ўяўленні.

Як мастак-псіхолаг Колас не абмежаваўся толькі сферай грамадскай, асветнай працы настаўніка, а ўвёў у твор і сюжэтную лінію асабістых адносін Лабановіча з дачкой пана падлоўчага Ядвісяй. Праз стасункі герояў – іх кароткія сустрэчы, дасціпныя размовы, спрэчкі – пісьменнік здолеў пераканаўча выявіць непаўторныя рысы, асаблівасці характару, пранікнуць ва ўнутраны свет кожнага з іх, г. зн. стварыў вобразы жывых людзей.

У другой кнізе Я. Колас вывеў свайго героя на больш шырокі прасцяг грамадскай дзейнасці, псіхалагічна абгрунтаваў непазбежнасць яго пераходу ад асветніцкай працы да рэвалюцыйнай барацьбы. Пераход адбываўся не без цяжкасцей і ваганняў, бо Лабановіч, носьбіт гуманістычнага пачатку, разумеў, што барацьба непазбежна звязана з чалавечымі ахвярамі, нясе вялікія разбурэнні, незлічоныя страты. Вось чаму ён і зараз не адмаўляецца цалкам ад прапаганды мірных, асветніцкіх ідэй. Не выпадкова ж у гэты час у размове з бескампраміснай, празмерна ваяўнічай рэвалюцыянеркай Андросавай настаўнік выказвае намер арганізаваць вандроўку па Беларусі з мэтаю сабраць народныя песні, легенды, казкі. Ён прадчувае: рэвалюцыя можа знішчыць многае з таго, што звязана з гістарычным мінулым, з сівой даўнінай, у тым ліку і фальклорам як праявай духоўнай культуры народа.

Другая кніга «палескіх аповесцей» заканчваецца на драматычнай ноце – сцэнай арышту настаўніка за ўдзел у напісанні петыцыі ў падтрымку сялян, пакрыўджаных памешчыкам. А тут яшчэ стала вядома, што аб'яўленая свядомымі рабочымі забастоўка не атрымала шырокай падтрымкі («паўстанне задушана, гарады заліты кроўю»). Тым не менш Лабановіч не адхрышчваецца ад ідэі неабходнасці барацьбы з царызмам, з эксплуататарамі. Гэтаму этапу яго жыцця прысвечана заключная кніга – «На ростанях» (1948–1954), якая прадэманстравала новы ідэйна-эстэтычны ўзровень беларускай мастацкай прозы, яе вялікіх эпічных формаў.

Вядома, творчае развіццё Я. Коласа не заўсёды ішло па ўзыходзячай лініі. На шляху пісьменніцкіх пошукаў былі не толькі дасягненні, але і адчувальныя страты. Так, у прыватнасці, здарылася ў трагічную эпоху 1930-х гг. У гэты час пісьменнік даволі актыўна выступае ў друку з аповесцямі («Адшчапенец», 1930 – 1931; «Дрыгва», 1934), п'есамі («Вайна вайне», 1936; «У пушчах Палесся», 1937), працягвае працу над распачатай у 1926 г. паэмай «На шляхах волі». Нямала зроблена ім і як перакладчыкам твораў Пушкіна, Лермантава, Шаўчэнкі, Міцкевіча на беларускую мову. Колас шмат ездзіць па Беларусі, сустракаецца з чытачамі, распавядае пра вынікі першых пісьменніцкіх з'ездаў, прапагандуе дасягненні суседніх літаратур. Але творчая актыўнасць народнага паэта не знаходзіць адэкватнага выяўлення: многія творы сёння ўспрымаюцца як панегірыкі пра велічныя дасягненні савецкай краіны, пра небывалы росквіт беларускай культуры, у іх дамінуе параднасць, казённы аптымізм, святочны настрой. Негатыўныя, драматычныя моманты жыцця народа, канфлікты і супярэчнасці выпадалі з поля зроку пісьменніка.

Такімі ж няпростымі, як і 1930-я гг., аказаліся для Коласа і гады ваеннага ліхалецця. Доўгі час народны паэт змушаны быў жыць па-за межамі Беларусі – у Падмаскоўі, у Ташкенце. Адарванасць ад роднага краю, цяжкія матэрыяльныя ўмовы, бытавая неўладкаванасць, – усё гэта перашкаджала засяроджанай творчай працы. І ўсё ж, нягледзячы на нягоды, на дрэнны стан здароўя, у гэты перыяд Колас актыўна выступае ў друку з вершаванымі творамі, піша паэмы «Суд у лесе» (1943) і «Адплата» (1943–1944), прысвечаныя тэме барацьбы беларускага народа

з фашысцкімі акупантамі. Абмежаванасць ведаў пра тое, як жылі, ваявалі партызаны, якімі былі іх стасункі з мясцовым насельніцтвам, вядома, не маглі не адбіцца на мастацкім узроўні твораў, на глыбіні раскрыцця тэмы і абмалёўцы вобразаў народных мсціўцаў. Аднак з асаблівай паўнатой і яскравасцю раскрыўся ў гэты перыяд талент Коласа-публіцыста, яго здольнасць скіроўваць вострае пісьменніцкае слова на мабілізацыю ўсіх сіл народа дзеля дасягнення перамогі над фашызмам. Прамовы, выступленні, інтэрв'ю Коласа ў адрозненне ад матэрыялаў 1930-х гг. змястоўныя, глыбокія, у іх няма таннай пафаснасці, штучнага аптымізму, імкнення абмінуць ценявыя бакі жыцця, што якраз і мела месца ў публікацыях папярэдняга дзесяцігоддзя. Калі на пачатку вайны Колас-публіцыст задавальняўся эмацыянальным асуджэннем фашызму як з'явы, варожай жыццю, сусветнай культуры, дык пазней прамоўніцкая заклікальнасць дапаўняецца аналітычным разглядам складаных пытанняў міжнароднага жыцця, у тым ліку такіх, як пасіўныя паводзіны саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі, прычыны іх затрымкі з адкрыццём другога фронту, пытанне аб пасляваеннай дзяржаўнай мяжы паміж Беларуссю і Польшчай. Часта звяртаўся Колас да балючай праблемы здрадніцтва, калабарацыі, супрацоўніцтва пэўнай часткі беларусаў з акупантамі. З вышыні сённяшніх дзён бачна, што пры асвятленні згаданай праблемы Колас дапускаў аднабаковасць, не заўсёды ўлічваў экстрэмальныя ўмовы жыцця мірных людзей пры акупацыйным рэжыме.

У асобны блок аб'ядноўваюцца публіцыстычныя артыкулы Коласа, прысвечаныя аднаўленню разбуранай вайной гаспадаркі Беларусі, ролі творчай, навуковай інтэлігенцыі ў адраджэнні краіны, яе культуры, у выхаванні нацыянальнай свядомасці. Выступаючы на сесіі АН БССР (1944, Масква), Колас так акрэсліў задачы творчай інтэлігенцыі ў аднаўленчы перыяд: «Беларускі народ не атрымаў яшчэ з нашых рук свае гісторыі, аповесці аб слаўнай многавяковай барацьбе за незалежнасць, за культуру, за сваю нацыянальнасць, за зямлю сваіх продкаў». Звернем увагу і яшчэ на адзін невялічкі фрагмент з прамовы, недастаткова асветлены ў айчынным коласазнаўстве: «Мы павінны вярнуць народу яго сыноў, якія бытуюць у памяці не па сваіх пашпартах». Далей ідзе падагульняючы сказ, якім заканчваецца выступленне: «Усе сілы, усе здольнасці свае паставім на службу і навуцы, і народу». Выказванне пра «сыноў» лаканічнае па форме, асцярожнае па змесце, але сэнс яго шматзначны. Па-першае, Колас, напэўна, меў на ўвазе пісьменнікаў, дзеячаў культуры, асветы, якія чакалі аб'ектыўнай ацэнкі сваёй працы і свайго месца ў гісторыі Беларусі (ліберальна-буржуазныя, рэакцыйныя дзеячы і г. д.). Па-другое, з разважанняў прамоўцы лагічна вынікала неабходнасць перагляду несправядлівых прысудаў, вынесеных у 1930-я гады сумленным людзям. Неабходна было зняць з іх кляймо «вораг народа», вярнуць у адпаведнае працоўнае, прафесійнае асяроддзе, каб не на словах, а на справе паставіць усе творчыя, інтэлектуальныя, духоўныя сілы «на службу і навуцы, і народу». Вось якімі смелымі і аптымістычнымі былі надзеі народнага песняра напярэдадні вяртання на родную зямлю.

Узнікалі перад Коласам складанасці творчага характару і ў пасляваенны перыяд. Звязаны яны з імкненнем пісьменніка-грамадзяніна праўдзіва, без прыхарошвання, без лакіроўкі паказаць тагачаснае жыццё і з немагчымасцю ажыццявіць свае намеры. Да творчых здабыткаў народнага паэта нельга аднесці, у прыватнасці, і «культаўскія» вершы, і публіцыстычныя артыкулы, у якіх услаўляліся – насуперак рэальнаму становішчу – грандыёзныя дасягненні народа пад кіраўніцтвам партыі. Але, урэшце, не гэтымі выдаткамі, а яны былі народжаны канкрэтнымі грамадска-палітычнымі абставінамі часу, вызначаецца сапраўдная роля Якуба Коласа ў дзяржаўна-культурным будаўніцтве, у развіцці беларускага прыгожага пісьменства, ва ўзбагачэнні літаратуры новымі героямі, жанрава-стылёвымі формамі, у выхаванні нацыянальнай свядомасці беларусаў, у мастацкім, эстэтычным, патрыятычным выхаванні. Месца і роля Коласа ў выпрацоўцы нацыянальнай мастацкай традыцыі, ва ўсталяванні погляду на літаратуру як на з'яву эстэтычную, якая развіваецца паводле сваіх унутраных, іманентных законаў, погляду як на адбітак духоўнага, інтэлектуальнага, маральнага вопыту народа – надзвычай вялікія, неацэнныя. Спадчына Коласа – надзейны, трывалы падмурак усяго нацыянальнага быцця беларусаў, жыватворная крыніца, з якой маладое пакаленне творцаў чэрпае веру ў заўтрашні дзень краіны. Якуб Колас разам з геніяльным паплечнікам Купалам і таленавітымі аднадумцамі з пісьменніцкай супольнасці многае зрабіў, каб беларускае слоўнае мастацтва ўзнялося на еўрапейскі ўзровень і ў лепшых праявах стала ўпоравень з вышэйшымі дасягненням сусветнай літаратуры. І сваімі

уласнымі творамі Колас паслядоўна і мэтанакіравана сцвярджаў агульначалавечыя каштоўнасці – ідэі гуманізму, дабрыні, міласэрнасці, веру ў перамогу дабра над злом, светлага, сцвярджальнага пачатку над разбуральным.

Як ужо адзначана вышэй, дзейнасць Коласа ўражвае шматграннасцю, шырынёй яго творчых інтарэсаў. У межах аднаго артыкула немагчыма нават у агульных рысах акрэсліць абсягі ім здзейсненага. Па-за разглядам застаюцца многія бакі творчай працы Коласа, у прыватнасці, як таленавітага перакладчыка, літаратурнага крытыка, педагога-метадыста, лексікографа, аднаго з шматгадовых кіраўнікоў пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі, дэпутата Вярхоўнага Савета СССР і БССР. Апрача таго, Колас пакінуў багатую эпісталярную спадчыну – найкаштоўнейшую крыніцу вывучэння яго жыцця і творчасці. Перапіска паэта з роднымі, блізкімі, з пісьменнікамі ўспрымаецца як своеасаблівы жанр спавядальнай прозы.

Асабліва ж вялікую ролю адыграў Я. Колас як арганізатар айчыннай навукі. Нязменны віцэ-прэзідэнт і член Прэзідыума Беларускай Акадэміі навук з дня яе заснавання, К. М. Міцкевіч на працягу амаль трох дзесяцігоддзяў непасрэдна ўдзельнічаў у выпрацоўцы стратэгічных кірункаў развіцця навуковых пошукаў, перш за ўсё ў гуманітарнай сферы, у карэкціроўцы планаў навукова-даследчай працы, рабіў практычныя захады па ўмацаванні і захаванні кадравага патэнцыялу ўстановы, па адкрыцці новых даследчых спецыяльнасцей, каб забяспечыць паступовы рух айчыннай навуковай думкі і запатрабаванні розных галін народнай гаспадаркі. З выступленняў віцэ-прэзідэнта бачна, што ён рашуча абараняў прыярытэт фундаментальных даследаванняў, хоць і прыкладныя аспекты ім таксама не ігнараваліся. Яшчэ ў артыкуле «Мабілізаваць масы» (1933) Колас выступіў у абарону высокага статусу Акадэміі як галоўнага навуковага і разам з тым каардынуючага цэнтра рэспублікі. Па ініцыятыве і па рэкамендацыі Коласа ў Беларусь на сталую працу ў розныя часы былі запрошаны многія таленавітыя вучоныя. Шмат намаганняў прыкладзена віцэ-прэзідэнтам па рэабілітацыі і вяртанні ў Акадэмію рэпрэсіраваных даследчыкаў розных навуковых спецыяльнасцей, у тым ліку літаратуразнаўцаў, гісторыкаў літаратуры і мастацтва. Вялікае значэнне мелі артыкулы Коласа пра захаванне архіўных дакументаў, пра неабходнасць своечасовага забеспячэння бібліятэк новымі кнігамі.

Акадэмік К. М. Міцкевіч не абмяжоўваўся, аднак, толькі адміністрацыйнымі функцыямі, але выступаў і з навуковымі дакладамі на сесіях і агульных сходах Акадэміі, браў самы чынны ўдзел у абмеркаванні пытанняў, звязаных з рэформай беларускага правапісу, з падрыхтоўкай слоўнікаў, мовазнаўчых прац, з рэдагаваннем падручнікаў па гісторыі беларускай літаратуры. Нават даводзілася быць афіцыйным апанентам пры абароне доктарскай дысертацыі. Як бачым, і ў справе разгортвання навуковых даследаванняў, і ў прапагандзе навуковых ведаў Я. Колас пакінуў прыкметны след. Велізарны асабісты літаратурна-творчы вопыт даваў яму магчымасць дакладна вызначаць ролю гуманітарнай навукі як дзейснага фактару ў працэсе дзяржаўна-культурнага будаўніцтва і выхавання чалавека ў лепшых гуманістычных традыцыях.

Адной з найбольш эфектыўных форм годнага ўшанавання памяці вялікіх сыноў Бацькаўшчыны з'яўляецца выданне іх спадчыны. У 2007 г. выдавецкі дом «Беларуская навука» распачаў выданне новага Збору твораў Я. Коласа ў 20 т., падрыхтаванага супрацоўнікамі Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. Хочацца спадзявацца, што завяршэнне гэтага фундаментальнага праекта паслужыць новым імпульсам для шырокага вывучэння несмяротных твораў класіка айчыннай літаратуры, вялікага сына беларускага народа.

## Літаратура

1. *Колас, Я.* Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас. – Мінск, 2007.

*M. I. MUSHINSKY*

**GREAT ARCHITECT OF THE NATIONAL CULTURE**

## Summary

Main stages of the creativity way of Yakub Kolas have been traced in the article. Specific of his creative individuality has been showed as well as his place and role in the Belarusian culture and literature development, his scientific and scientific organizer's activities.